концептуальные-основания-и-организация-деятельности.pdf. – Дата доступа: 18.05.2018.

2. *Дмитриевская, Н.* Санкт-Петербург: в поисках горожанина / Н. Дмитриевская // Телескоп: наблюдение за повседневной жизнью петербуржцев. – 2001. – № 3. – С. 2–5.

3. Численность населения на 1 января по областям Республики Беларусь // Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа: http://www.belstat.gov.by /ofitsialnaya-statistika/ssrd-mvf_2/natsionalnaya-stranitsa-svodnyh-dannyh /naselenie_6/dinamika-chislennosti-naseleniya/. – Дата доступа: 25.05.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАБЛЕМА СУАДНОСІН ЭТЫЧНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ АСПЕКТАЎ ПРЫНЦЫПУ ПАТРЫЯТЫЗМУ

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Ідэя глыбокай узаемасувязі этычнага і эстэтычнага, выказаная ў антычнай філасофіі, застаецца актуальнай і важнай па сённяшні дзень – і ў агульным плане, і пры рашэнні канкрэтных праблем, тэарэтычных і практычных, звязаных з распрацоўкай і рэалізацыяй пэўных жыццёвых стратэгій. Неад’емным элементам комплексу задач, якія чалавек вырашае ў гэтым кантэксце, з’яўляецца вызначэнне характару сваіх паводзін у дачыненні да роднай зямлі, народа і дзяржавы. У гісторыі чалавецтва і ў сучаснасці мелі і маюць месца розныя варыянты адпаведных духоўных праграм і праектаў. Найбольш натуральнымі з’яўляюцца тыя з іх, што грунтуюцца на пачуцці глыбокай інтымнай повязі з родным краем. Гісторыя замацавала за адпаведным прынцыпам назву «патрыятызм».

Паколькі патрыятычны настрой думак грунтуецца на пачуцці глыбокай любові да радзімы, можа паўстаць уражанне, што ён не патрабуе спецыяльнага тэарэтычнага абгрунтавання: праз наяўнасць згаданага пачуцця мае адбыцца яго найвышэйшая легітымацыя. І ў пэўным сэнсе дадзенае ўражанне з’яўляецца праўдзівым: любоў сапраўды не стасуецца з абгрунтавальнымі працэдурамі, і таму, хто з пэўных прычын, адчуваць яе не здольны, абгрунтаваць і даказаць яе неабходнасць немагчыма. Аднак феномен любові ўвогуле і любові да Радзімы ў прыватнасці можа і павінен быць прадметам тэарэтычнага (філасоф-

скага) аналізу, паколькі ў ім яскрава ўвасабляюцца найістотнейшыя характарыстыкі чалавечага быцця. Разам з тым філасофскія погляды пэўнага індывіда могуць быць рэлевантнымі для наяўнасці ці адсутнасці ў яго патрыятычных пачуццяў. Як вядома, касмацэнтрычная антычная натурфіласофія з уласцівай ёй ідэяй ўніверсальнага светапарадку і памкненнем гэты светапарадак выявіць належыць да перадумоў для фарміравання альтэрнатывы патрыятычнаму настрою думак (яна атрымала назву касмапалітызму) [6, т. 4, с. 1155]. Касмапалітычныя погляды сілкаваліся і далейшым развіццём філасофскай думкі (сваё першае ўвасабленне яны атрымалі ў пошуках сафістаў у кантэксце здзейсненай імі сістэматычнай крытыкі прыватнага, усталяванага людзьмі закона, якая грунтавалася на артыкуляцыі ўніверсальнага характару прыроды [Там жа]). Такім чынам, на дадзеным узроўні гаворка ідзе пра барацьбу аргументаў у згаданым змястоўным абсягу і спасылкі на вяршэнства адпаведнага пачуцця перад усялякім тэарэтычным дыскурсам недастаткова.

Неабходна мець на ўвазе, што ідэя непадзельнага адзінства эстэтычнага і этычнага не заўжды ўспрымалася філосафамі як адэкватная і надзейная аснова тэарэтычных і практычных пошукаў: Ф. Ніцшэ, напрыклад, супрацьпастаўляў адзін аднаму гэтыя пачаткі і аддаваў адназначную перавагу эстэтычнаму, узятаму ў яго адэкватнай, недэкадэнцкай форме (свет для яго апраўданы толькі як эстэтычны феномен) [5, с. 75]. Момант іх супрацьпастаўлення характэрны ў дастаткова моцнай ступені і для поглядаў С. К'еркегара, які ў адрозненне ад Ніцшэ ўсталяваў этычнае па-над эстэтычным (пададзеным у досыць аднабаковай форме яго самавыяўлення) як больш высокі тып чалавечага існавання [6, т. 1, с. 580]. Разам з тым філосаф не спыніўся на іх калізіі, указваючы, што на найвышэйшым – рэлігійным – экзістэнцыяльным узроўні абодва моманты сінтэзуюцца, набываючы новы, трансфармаваны выгляд, і ў гэтым сэнсе захоўваюцца ў іх пераадоленні [7].

Тым не менш на прыкладзе прынцыпу патрыятызму (хоць, натуральна, не толькі на яго прыкладзе) можна пераканацца, што ў выпадку абсалютызацыі аднаго з гэтых яго бакоў дэфармуецца яго сутнасць і мы пазбаўляемся магчымасці гарманічнага яго здзяйснення. Сапраўды, эстэтычнае па-за яго арганічнай сувяззю з этычным губляе і сваю повязь з усёй паўнатой жыццёвай практыкі, а этычнае ў адпаведнай сітуацыі страчвае здольнасць быць салодкім абавязкам, улучаным у кантэкст ба-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гацця і радасці быцця. Такім чынам, у абодвух момантах павінна быць першапачаткова замацавана памкненне да паяднання: у высокай энергетыцы «нацыянальнага эрасу» – інтэнцыя да самаператварэння ў маральную норму, а ў патрабавальным поклічы сумлення аддана служыць Радзіме – адчуванне прыгажосці гэтага служэння.

Магчымасць і неабходнасць арганічнй еднасці абедзвюх сфер грунтуецца на непадзельным адзінстве агульначалавечага ідэалу. На гэтым высокім узроўні дабро і прыгажосць (а таксама праўда) павінны разглядацца як неад'емныя бакі адзінага цэлага, як неабходныя ўвасабленні адзінага першапачатку, тоесныя ў сваёй рознасці. Памкненне ўзняцца да яго праз самаадданую творчую працу выступае як найважнейшая характарыстыка духоўнасці, і прынцып патрыятызму – у згодзе з прапанаванай яго інтэрпрэтацыяй – арганічна ўлучаецца ў адпаведны кантэкст. У сувязі з гэтым абсалютна відавочным робіцца яго грунтоўнае значэнне для самаразвіцця яго носьбітаў: у дзейнай любові чалавек узнімаецца ў самыя высокія сферы свайго быцця. Той момант, што Айчына належыць да феноменаў, здольных выклікаць любоў і адпаведныя гэтаму пачуццю жыццёвыя практыкі, не выклікае ніякіх сумненняў.

Варта адзначыць, што бліскучае па сваёй пераканальнай сіле абгрунтаванне прынцыпу патрыятызму было дадзена ў абсягу нямецкага ідэалізму. І гэта цалкам заканамерна, бо характэрная для яго дыялектычная метадалогія надзвычай пасуе сінтэтычнай сутнасці дадзенага прынцыпу і выступае, такім чынам, як надзвычай эфектыўны і плённы сродак і яго асэнсавання, і аргументаванай яго рэпрэзентацыі ў кантэксце філасофскіх дыскусій. Патрыятызм (у фіхтэанскім яго бачанні) узнімаецца да сакральнага ўзроўню, бо нацыя разглядаецца тут як абалонка вечнага, як спецыфічнае ўвасабленне і форма развіцця боскага першапачатку [6, т. 7, с. 212]. З гэтага пункту гледжання патрыятычны настрой думак ні ў якім разе не можа быць пададзены як аднабаковая жыццёвая пазіцыя, сцэнтраваная на абмежаваным лакальным абсягу, няздольная ўзняцца да ўніверсальнага, агульначалавечага і паважліва паставіцца да іншых культур. Усведамляючы сваю Бацькаўшчыну і свой народ як адмысловы вобраз усеагульнага і вечнага, патрыятычна настроеная асоба павінна прызнаць за іншымі нацыямі ідэнтычны статус, што адкрывае шлях да плённых дыялагічных міжкультурных стасункаў, выбудаваных на прынцыпах узаемаразумення і ўзаемнай павагі, г. зн. адпаведны настрой думак ся-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гае ў сферу этычнага. Разам з тым не выключаная і іншая інтэрпрэтацыя дадзенага моманту, згодна з якой розныя нацыі ў рознай ступені ўвасабляюць субстанцыянальную першаснову свету і тым з іх, што дасягаюць больш высокага, чым іншыя, узроўню згаданага ўвасаблення, цалкам легітымна належыць роля правадыроў, у згодзе з якой яны маюць права вяршыць лёс астатніх народаў. У такім вытлумачэнні, аднак, сутнасць ідэі іманентнай прысутнаці агульначалавечага прынцыпу ў адметных нацыянальных утварэннях скажаецца, а натхнёныя ім сацыяльныя практыкі вядуць да негатыўных і нават трагічных наступстваў.

Сакральнае вымярэнне феномена патрыятызму з'яўляецца найважнейшай, але не вычарпальнай яго характарыстыкай: як боскі першапачатак разгортвае сябе навыварат, у свет паасобнага і адмысловага, так і патрыятычны настрой думак павінен здзейсніцца ў канкрэтных справах на карысць Радзімы, палымяная любоў да яе – у дзеяннях, нярэдка простых і някідкіх, але тым не менш важных для яе самаразвіцця. Адзначым, што менавіта ў гэтым пункце і выяўляецца найбольш яскравым чынам адзінства эстэтычнага і этычнага аспектаў прынцыпу патрыятызму: усёабдымная, «эратычная» цяга да роднай зямлі, да яе прыгажосці як праява эстэтычнага ў ім пераплаўляецца ў паўсядзённым жыцці ў этычную норму, якая мусіць зноў і зноў быць задзейнічана ў розных сітуацыях.

Варта адзначыць – і гэта можа і павінна быць прадметам нашага нацыянальнага гонару, – што на найвышэйшым узроўні самаразвіцця беларускай культуры патрыятычны прынцып здзяйсняецца ў арганічным адзінстве яго эстэтычнага і этычнага вымярэнняў. Беларускі народ выхаваў, выпеставаў сваю духоўную эліту, прадстаўнікі якой у сваім жыцці і творчасці здзейснілі сапраўдны подзвіг на карысць Радзімы, натхнёныя пачуццём самай гарачай любові да яе, «нацыянальным эрасам» (такі выраз Антон Адамовіч ужывае ў дачыненні да настрою думак Алеся Гаруна, які займае выдатнае месца ў беларускім пантэоне [2, с. 1085]).

У дадзенай сувязі адзначым найперш, што выбітныя прадстаўнікі нашага народа ўсведамлялі і ўсведамляюць глыбокую ўзаемасувязь агульначалавечага і нацыянальнага. У Ігната Абдзіраловіча, напрыклад, няма і ценю сумнення ў тым, што «разам зь беларушчынай мы трацім і лепшую частку чалавечнасьці» [1, с. 16], а інтэлектуальны запавет Францыска Скарыны перадаецца ім у сціслай, але надзвычай змястоўнай форму-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ле, згодна з якой вялікі асветнік быў «духам агульначалавечым толькі ў беларускай скуры» [1, с. 9]. Урачысты покліч да самастойнай творчасці, які філосаф скіроўвае да беларускага народа, пачуты ім самім з глыбіняў быцця, з якіх струменіць магутны творчы пачатак: «Усё існуючае творча» [1, с. 38]. Разам з тым на прыкладзе яго поглядаў пераканальна пацвярджаецца выснова, згодна з якой патрыятызм у адэкватнай форме яго вытлумачэння і вызнавання валодае імунітэтам супраць імперыялістычнага самаскажэння. Сапраўды, мысляр недвухсэнсоўна даводзіць, што «не павінна быць беларускага мэсыянізму ў вялікім і малым, і для сваіх і чужых ён – прымус, здзек і сьмерць» [1, с. 17–18]. Ідэнтычны настрой думак выяўляецца і ў знакамітых радках Францішка Багушэвіча, у якіх без усялякай пыхі і сентыментальнасці, але з глыбокай любоўю да роднай мовы і высокай павагай да моў іншых народаў падкрэсліваецца, што «мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая» [3, с. 33].

«Нацыянальны эрас», які вызначае жыццё і творчасць выдатных дзеячаў беларускай культуры, скіроўваецца ў маральна-практычную сферу таксама праз цудоўнае разуменне імі той акалічнасці, што маці-Радзіма ніколі не зойме свой «пачэсны пасад між народамі» без нашай штодзённай упартай працы дзеля яе росквіту. У Алеся Гаруна згаданае разуменне набывае форму простага і яснага практычнага імператыву: «Найперш трэба пакінуць гультайства. Потым трэба любіць сваю Бацькаўшчыну. Потым узяцца за спаўненне сваіх абавязкаў. Ідзі і рабі тое, да чаго цябе вучылі. І помні заўсёды, што ты робіш гэта дзеля Бацькаўшчыны. А таму – рабі добра» [4, с. 383].

Такім чынам, артыкуляцыя непадзельнага адзінства этычнага і эстэтычнага аспектаў патрыятычнага настрою думак засцерагае ад аднабаковых, скажоных версій яго разумення і практычнага выяўлення. Адзначанае адзінства дапускае, безумоўна, дамінаванне пэўнага з гэтых момантаў у той ці іншай сітуацыі, аднак згаданае – кантэкстуальнае, сітуацыйнае – дамінаванне не павінна разбурыць іх адпачатковую тоеснасць, зрабіўшыся татальным. Дадзенае даследаванне паказала, што інтэлектуальная эліта беларускага народа ўзнялася менавіта да сінтэтычнага вытлумачэння прынцыпу патрыятызму, стварыўшы трывалы падмурак для адэкватнай яго рэалізацыі ў нашай культурнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Менск : Выд. Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.
3. *Багушэвіч, Ф.* Выбраныя творы / Францішак Багушэвіч; уклад. з тэксталагіч. падрыхт., прадм. і камент. Язэпа Янушкевіча. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 445 с. [4] л. іл. – (Беларускі кнігазбор: БК. Серыя 1, мастацкая літаратура).
4. *Гарун, А.* Выбраныя творы / Алесь Гарун ; уклад., прадм., камент. У. Казберука. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2003. – 448 с. (4) с.: іл. – (Беларускі кнігазбор ; Сер. 1. Мастацкая літаратура).
5. *Berrios, R.* Nietzsche / R. Berrios, A. Ridley // TheRoutledge Companion to Aesthetics. – Ed. by B. Gaut and D. McIver Lopes. – London and New York : Routledge, 2005. – P. 75–86.
6. Historisches Wörterbuchder Philosophie : in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971–2007. – B. 1. – 1046 S. ; B. 2. – 1152 S. ; B. 3. – 1272 S. ; B. 4. – 1470 S. ; B. 5. – 1448 S. ; B.6. – 1396 S. ; B. 7. – 1842 S. ; B. 8. – 1519 S. ; B. 9. – 1558 S. ; B. 10. – 1618 S. ; B. 11. – 1276 S. ; B. 12.– 1556 S ; B.13. (Register) – 1045 S.
7. McDonald, William, "Søren Kierkegaard", The Stanford Encyclopedia of Philosophy (Winter 2017 Edition), Edward N. Zalta (ed.), URL = <https://plato.stanford.edu/archives/win2017/entries/kierkegaard/>.

# МОНАСТЫРСКОЕ ИСКУССТВО: К ПРОБЛЕМЕ ТЕРМИНОЛОГИИ

***Е. Н. Багрий,***
*аспирант Белорусского государственного университета культуры и искусств*

В современных реалиях возрастает интерес общества к духовной жизни, люди ищут свое место в сложном информационном мире. Духовное становление немыслимо без приобщения к культуре и искусству, поэтому в настоящее время церковное искусство становится все более популярным объектом исследования, которое требует еще более внимательного рассмотрения и изучения предмета изнутри.

Искусство – это творческое воспроизведение окружающего мира в художественных образах, при этом оно является особой областью духовной деятельности человека. Монастырское ис-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ